Дук Д.У. ***(Наваполацк)***

АРХЕАЛАГІЧНАЯ РАЗВЕДКА НА ЗАПАЛОЦКІМ ПАСАДЗЕ ПОЛАЦКА Ў 2003 Г.

Археалагічная разведка ў Запалоцці была праведзена ў маі 2003 г. з мэтаю ўдакладнення гістарычнай тапаграфіі Полацка, высвятлення ролі і месца Запалоцкага пасада ў гісторыі горада. Пры абранні месца археалагічнай разведкі мы кіраваліся наступнымі меркаваннямі: 1) ступенню даследаванасці тэрыторыі, 2) размяшчэннем помніка, 3) звесткамі, атрыманымі ад мясцовых жыхароў.

Зыходзячы з гэтага, для правядзення шурфоўкі была абрана пляцоўка ў паўночнай частцы старажытнага Запалоцкага пасада, на якой зараз размешчаны агароды (мал. 1).

Дадзеная тэрыторыя ў археалагічным плане не даследавана. Помнік размешчаны ў гістарычнай частцы Полацка ў межах ахоўнай зоны Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. З усходу да яго прылягае правы бераг Палаты і Верхні замак (раён г. зв. Машны) (Тарасаў, 2001, с. 43), з захаду і поўдня – паўночная ўскраіна шчыльна заселенага Запалоцкага пасаду, з поўначы – сучасны мікрараён Полацка (Аэрадром). Адлегласць да Дзвіны роўная 500 м.

Тэрыторыя, занятая агародамі, уяўляе сабой роўную, паўкруглую па форме пляцоўку плошчаю каля 2 га, пакатa нахіленую да Палаты (геадэзічныя адзнакі вышыні 116—118 м па балтыйскай шкале). З паўднёвага ўсходу пляцоўкі візуальна бачны роў надпоймавай тэрасы Палаты з перападам вышынь да 2—3 м (геадэзічныя адзнакі 112—113 м). З астатніх бакоў пляцоўку агінае стромкі схіл гары вышынёй 8—10 м (адзнакі 126—131 м), ад краю якога пачынаецца забудова сучаснага Запалоцця (мал. 1).

Са слоў мясцовых жыхароў, на агародах яны часта знаходзілі кераміку, побытавыя жалезныя вырабы і старыя манеты. Большая палова агародаў зараз не апрацоўваецца. Узараныя агароды маюць насычана чорны колер глебы і візуальна выразна вылучаліся на фоне мінулагодняй травы. З паверхні разаранай глебы намі быў сабраны пад'ёмны матэрыял: кавалкі плінфы таўшчынёй 3,5 і 4 см, дробныя фрагменты паліванай кафлі, керамічны посуд XI–XVIII стст. Асабліва цікавымі знаходкамі з'яўляюцца шыфернае праселка, бронзавы пярсцёнак і бразготка (мал. 3: 1—3). Падобныя грушападобныя бразготкі з крыжападобнай прораззю па ноўгарадскай храналогіі належаць да сярэдзіны X–XI стст. (Колчин, 1982, рис. 8). З пад'ёмнага матэрыялу вылучаюцца пацеркі, знойдзеныя ў дадзенай частцы Запалоцця мясцовымі жыхарамі (мал. 3: 4—6). Паводле С.В. Тарасава, шкляная пацерка датуецца X ст., бурштынавая – IX–сярэдзінай XII стст. (Тарасаў, 2001, с. 33).

На тэрыторыі аднаго з закінутых агародаў з дазволу ўладальнікаў быў разбіты шурф 1 памерамі 2 х 2,5 м, размешчаны па накірунку ўсход-захад. Прывязка шурфа 1 зроблена да апорных слупоў лініі электраперадачы (мал. 1).

Стратыграфія культурных напластаванняў шурфа 1. *Верхні* пласт светла-шэрай буйнакамкаватай зямлі мае магутнасць ад 0,7 да 1,1 м і пачынаецца адразу пад дзірваном (адзнакі па нівеліру 28—35 см). Гэты пласт даволі аднародны па структуры, у ім сустракаюцца кавалкі цаглянага друзу, камяні каля 5 см дыяметрам, драўляная парахня. Гэты пласт перасякае невялікая (5 см) прапластка вапны на глыбіні каля 0,4 м ад дзённай паверхні.

Археалагічныя знаходкі са стратыграфічнага пласта вышэй вапнавай прапласткі прадстаўлены кавалкамі керамічнага начыння, з іх пераважае непаліваны посуд – гаршкі, зробленыя на нажным ганчарным крузе, фрагмент кубачка, ножка ад рынкі. Частка венцаў гаршкоў мае S-падобны профіль і ўкладаецца ў дыяпазон XII–XIII стст. (мал. 7: 18—20). Былі знойдзены мурмельшпіль, чубук ад люлькі галандскага тыпу (мал. 6: 2—3), фрагменты шклянога начыння (аконнае шкло, бутэлькі, шкляніцы) (мал. 6: 7—8), жалезныя вырабы (цвікі, стрыжні, дэталі конскай вупражы) (мал. 8: 6—8, 12). Асобныя керамічныя вырабы светла-ружовага колеру з'яўляюцца ганчарным бракам ці спадарожнікамі ганчарнай вытворчасці (мал. 6: 1).

У пласце светла-шэрай глебы ніжэй вапнавай прапласткі знойдзены посуд, зроблены на ручным ганчарным крузе: венцы і донцы гаршкоў пераважна XVI ст. (мал. 7: 1—3). Тут жа былі знойдзены цвікі, дзвярныя скобы, шыла ці прабойнік, жалезны язычок ад спражкі (мал. 8: 1—5, 9—10). Такім чынам, археалагічны матэрыял сведчыць пра час ўтварэння верхняга стратыграфічнага гарызонту ў XVI–XVIII стст.

Сярэдні стратыграфічны гарызонт прадстаўлены прапласткай шчыльнага камкаватага суглінку магутнасцю ў сярэднім 0,15—0,18 м. У асобных месцах пласт суглінку перакрывае прапластка вугалю магутнасцю 0,5—0,1 м. Прапластка суглінку мае чырвоны колер і пачынаецца з глыбіні 0,6—1,1 м (адзнакі па нівеліру 103—133). У гэтай прапластцы зафіксаваны лінзы вапны. Тут знойдзены посуд, зроблены на ручным ганчарным крузе канца XV – першай паловы XVI стст. і 2 фрагмента паўпразрыстага шкла зялёнага колеру ад ваконных шыбак (мал. 6: 7—8). Асаблівую цікавасць прадстаўляе фрагмент сценкі керамічнага начыння з геаметрычным малюнкам (мал. 7: 21). Звонку выраб пакрыты эмаллю цёмна-сіняга і светла-сіняга колеру, знутры – эмаллю шэрага колеру. Аналагічныя фрагменты посуду былі знойдзены ў раскопе 3 (2002 г.) на Вялікім пасадзе і па вусным вызначэнню І.У. Ганецкай належаць да групы імпартаванай турэцкай керамікі XVI ст. (Дук, 2003, фота 76: 2).

У шурфе 1 на глыбіні 1–1,2 м ад дзённай паверхні была выяўлена аснова печы ў выглядзе прамакутніка, памерамі 1,1 х 0,8 м (адзнакі па нівеліру 130—143). Печ перакрыта пластом чырвонага суглінку сярэдняга стратыграфічнага гарызонту і размешчана ў заходняй частцы шурфа 1 (мал. 2).

Сценкі печы мелі таўшчыню 0,2 м і вышыню 0,3 м і зроблены з чырвонай гліны, вапны, камянёў розных памераў, цэглы і цаглянага друзу. Печ арыентавана па накірунку паўночны-ўсход – паўднёвы-захад. Вусце печы выходзіла на паўднёвы-захад (мал. 2).

Рабочая (унутраная) частка печы займала прастору 0,45 х 0,75 м. Вусце печы мела шырыню каля 0,2 м.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Знутры печы, каля вусця, зроблена свайго рода падлога з чатырох камянёў 10 х 15 см, пакладзеных у адзін рад, і дзвюх цаглін у другім радзе. Быў знойдзены фрагмент дугі печы, які, верагодна, з'яўляўся скляпеннем вусця (мал. 5: 1). Дуга прадстаўляе сабой выгнутую аплаўленую цагліну, пакрытаю карычневай шкламасай – вынік тэрмічнага ўздзеяння. Магчыма вызначыць толькі таўшчыню дугі – 4 см, мяркуемая даўжыня – 20—25 см, дыяметр вонкавага выгіну каля 40 см.

Для будаўніцтва печы выкарыстоўваўся розны спадручны матэрыял: цэгла другаснага выкарыстання, камяні памерамі да 0,2 м, пры гэтым якая-небудзь вызначаная сістэма ў тэхніцы будаўніцтва не назіраецца. Так, паўднёва-ўсходняя сценка была зроблена з цэглы наступных памераў: № 1 – 22 (шырыня) х ? х ? см, № 2 – 12 х ? х ? см, № 3 10 х ? х ? см, № 4 – 10 х ? х ? см (мал. 2). Цэгла дрэннай якасці, крохкая, вызначыць яе таўшчыню вельмі цяжка, часта фіксуецца толькі чырвоная пляма развалу будаўнічага друзу на месцы залягання цэглы – вынік няякаснага абпалу. Заўважым, што дрэнна абпаленая цэгла была знойдзена падчас даследавання рэшткаў кафляных печаў XIV–XV стст. у полацкім княжацкім цераме (Заяц, 1997, с. 94). Пра таўшчыню цэглы з печы ў Запалоцці можна меркаваць па фрагментах. Падчас раскопак культурнага пласта каля печы былі знойдзена цэгла памерамі 9,7 х ? х 4,5 см, 8 х ? х 4—4,5 см і асобныя фрагменты таўшчынёй 3 см, 3,5 см і 4 см (мал. 5: 2—4), а таксама 3,7 см (№ 5) (мал. 2). Керамічнае цеста, з якога зроблена цэгла, аднароднага чырвонага колеру з дамешкамі буйной (да 0,8 см) жарствы. Можна выказаць меркаванне, што для будаўніцтва печы разам з камянямі і брусковай цэглай бралі плінфу шырынёй 22 см.

Пры будаўніцтве печы выкарыстоўвалася гаршковая кафля. Непасрэдна каля сценак і ўнутры печы сабраны нешматлікія фрагменты ў колькасці 9 адзінак, з іх – 3 венца, 2 – донца, 4 – сценкі. Венцы кафлі круглыя, іх дыяметр роўны 14 см, дыяметр донцаў 8 см. Кафля сфармавана на ручным ганчарным крузе на падсыпцы з зярністага пяску і жарствы, па краю донца зроблены борцік вышынёй да 0,5 см. Таўшчыня сценак 0,7–1 см. Керамічнае цеста кафлі добра вымешанае, з дамешкамі дробназярністай жарствы і пяску, чарапок светла-ружовы, адзін фрагмент сценкі дымлены, цёмна-шэрага колеру. Адсутнасць у печы цэлых кафляў і наяўнасць нешматлікіх фрагментаў сведчыць аб тым, што на пэўным этапе печ была старанна разабрана да асновы, пры гэтым былі сабраны нават дробныя кавалкі кафлі. Тым не менш на аснове знойдзеных фрагментаў можна правесці рэканструкцыю выгляду гаршковай кафлі з печы. За аснову рэканструкцыі неабходна прыняць таўшчыню сценак печы, якія павінны быць роўныя вышыні кафлі – 20 см, дыяметр венца і донца вядомы – адпаведна 14 і 8 см (мал. 4). Гэта адпавядае прапорцыям гаршковай кафлі, якая існавала на сінхронных па часу помніках – княжацкім цераме ў Полацку (варыянт 1: 21,5 х 13,5 х 10 см) і феадальнай сядзібе Лучна 1 у полацкай акрузе (варыянт А, падтып I: 20,5-21 х 14-15 х 7,5-8 см) (Дук, 2001, с. 167; Клімаў, 2003, с. 148).

Аснова печы была зроблена з цёмна-шэрага з чырвоным адценнем суглінку, які ўтварыў свайго рода падлогу (адзнакі па нівеліру 147—148). У чырвоную гліну дадаваўся пясок-рачнік і вапна. Гэты шчыльны, утрамбаваны, аднародны па структуры пласт, які зафіксаваны таксама ў заходняй сценцы шурфа каля печы.

Культурны пласт, на якім размешчана аснова печы, мае іншую характарыстыку. Гэта цёмна-шэры, камкаваты, вільготны пласт гумусу, з лінзамі да 10 см чырвонай будаўнічай гліны. Яго магутнасць дасягае 0,3 м. Пасярэдзіне гэты пласт перасякае вымастка з камянёў аднолькавых памераў (да 10 см) і цаглянага друза (адзнака па нівеліру 170). На адным стратыграфічным узроўні з гэтым пластом знаходзіцца пласт светла-шэрай глебы з лінзамі вугалю, яго магутнасць складае каля 0,6 м. Выяўлены лакальна ў межах паўднёва-заходняй частцы шурфа 1 (D-A, A-B). На профілі паўднёвай сценкі бачна, што пласт светла-шэрай глебы знаходзіцца над пластом супесі, а зверху перакрыты пластом чырвонага суглінку (мал. 2). У пласце светла-шэрай глебы была знойдзена бронзавая пус ейпі (мал. 8: 13), венца і сценка макотры з рыфленнем, посуд (фрагменты гаршкоў, макотра і накрыўка) (мал. 6 : 4—6; 7: 4—14, 16—17). Адно донца мела кляймо ў выглядзе крыжа ў крузе (мал. 6: 10). Большасць керамічнага начыння (венцы гаршкоў, макотра, накрыўка) тыповыя для XV ст. і маюць прамыя аналогіі з керамікай закрытых комплексаў Полацка (Заяц, 1997, рис. 4: 8-21).

Ніжні стратыграфічны пласт шурфа 1 прадстаўлены супессю жоўтага колеру, з зеленаватым адценнем каля мацерыка. Гэты пласт амаль без знаходак (трапіліся толькі маленькія кавалкі сценак начыння). Пласт пачынае фіксавацца ўжо на глыбіні 0,7–0,8 м (адзнакі па нівеліру 111–123) і працягваецца да мацерыка на глыбіні 2,1 м (адзнака 236). Яго магутнасць ва ўсходняй частцы шурфа 1 дасягае 1,2 м, у сярэднім 0,8 м. Пласт буйнакамкаваты, у ніжняй частцы з камянямі 5—10 см. У пласце каля ўсходняй сценкі зафіксаваны дробныя фрагменты чалавечых костак (частка чэрапа і некалькі дробных кавалкаў рэберных костак). Зверху пласт супесі перакрыты пластом чырвонага суглінку (B-C, C-D, D-A), на адрэзку D-A яшчэ і вугальнай прапласткай (мал. 2).

Мацярык шурфа 1 – шчыльны, моцна утрамбаваны суглінак шэра-зялёнага колеру на глыбіні 1,6—2,1 м (адзнакі па нівеліру 195—236 на ўзроўні грунтавых вод).

Пасля ўскрыцця асновы печы было вырашана яе не разбіраць з мэтаю паўторнага даследавання, кансервацыі і прывязкі да магчымых комплексаў. Печ была злёгку прысыпана глебай і перакрыта двухслойнай поліэтыленавай плёнкай. Шурф засыпаны. У бліжэйшым будучым не выключана магчымасць пад'ёму ўсёй печы для экспанавання ў краязнаўчым музеі.

Датаванне печы і магчымая рэканструкцыі знешняга выгляду. У запалоцкай печы выкарыстоўваўся адметны тып гаршковай кафлі, які ў Полацку знойдзены ў закрытым комплексе першай паловы XIV ст. (Заяц, 1997, с. 93). У абодвух выпадках назіраецца супадзенне памераў і прыёмаў фармавання кафлі. Тым не менш, адрозненне кафлі з Запалоцця ад кафлі з княжацкага церама хаця і не істотнае, але ўсё ж такі ёсць: гэта колер абпалу (у запалоцкай кафлі ён светла-ружовы, а не карычневы). Паводле М.В. Клімава, на помніку Лучна-1 вельмі блізкая па прапорцыях і колеру кафля

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выкарыстоўвалася ў печы канца XV – пачатку XVI ст. (Клімаў, 2003, с. 148).

Датаванне запалоцкай печы вызначаецца артэфактамі як непасрэдна з яе самой (кафля, цэгла), так і з культурнага пласта каля печы (керамічны посуд і бронзавая пус ейпі). Керамічны посуд па полацкім матэрыялам з закрытых комплексаў мае надзейнае датаванне ў межах XV ст. Аднак кафля, знойдзеная ў запалоцкай печы, выкарыстоўвалася ў Полацку з пачатку XIV ст. Такім чынам, кафля ўказвае на будаўніцтва печы ў XIV ст. Керамічны посуд, сабраны непасрэдна каля печы і ў прапластках пад ёй, датуе печ XV ст. Першая дата выклікае сумненні: цяжка ўявіць бытаванне печы напрацягу цэлага стагоддзя. Хутчэй за ўсё справа ў іншым. У XV ст. у Полацку працягвалі вырабляць гаршковую кафлю варыянта 1. Гэта адпавядае шматгаліновасці працэсаў фармавання і выкарыстання гаршковай кафлі не толькі ў паўночным рэгіёне (Полацка, Лучна), але і ў цэлым па Беларусі, на што ўжо звярталі ўвагу даследчыкі (Археалогія Беларусі, 2001, с. 322—323).

На сённяшні дзень цяжка правесці дакладную рэканструкцыю верхняй часткі (купала) печы. Прапорцыі печы з Лучна 1 блізкія да запалоцкай печы і складалі ў аснове 90 х 90 см пры вышыні 125 см (Клімаў, 2003, с. 151). Вышыня крыху больш 1 м магла быць і ў печы печы з Запалоцця (мал. 9). Новыя матэрыялы, якія магчыма атрымаць пры працягненні археалагічных даследаванняў у Запалоцці, павінны ўдакладніць выказаныя меркаванні.

Высновы. Атрыманыя ў выніку археалагічнай разведкі матэрыялы дазваляюць вызначыць асобныя высновы і акрэсліць напрамкі далейшага вывучэння Запалоцкага пасада.

Першае. Тэрыторыя паўночнай частцы Запалоцкага пасада (сучасныя агароды) утрымлівае культурныя напластаванні магутнасцю да 1,6–2,1 м з матэрыяламі ў дыяпазоне ад X–XI стст. Асноўная магутнасць культурных пластоў і пераважная большасць знаходак належыць да перыяду XV–XVIII стст.

Другое. Даследуемая тэрыторыя ў XV ст. з'яўлялася месцам жыхарства заможных гараджан. Папярэдне можна вызначыць, што ў паўночнай частцы Запалоцкага пасада месцілася адна ці некалькі феадальных сядзіб, сляды якой (развал кафляной печы) былі зафіксаваны падчас шурфоўкі. Унікальныя матэрыялы, атрыманыя ў выніку археалагічнай разведкі, дазваляюць вызначыць значнасць даследуемай тэрыторыі ў развіцці гістарычнай тапаграфіі горада, што выключае яе перыферыйнасць па меншай меры ў XV ст.

Трэцяе. Наяўнасць феадальнай забудовы ў XV ст. выключала магчымасць паводкавага падтаплення тэрыторыі паўночнай частцы Запалоцкага пасада (што нярэдка здараецца ў нашы дні). Можна выказаць меркаванне, што ў старажытнасці (XV–XVI стст., магчыма і раней) тэрыторыя паўночнай частцы Запалоцця (сучасныя агароды) з паўднёвага ўсходу была агароджана валам, сляды якога візуальна фіксуюцца і зараз (мал. 1). Вал абараняў заселеную тэрыторыю ад разбуральнага ўздзеяння паводкі і, верагодна, меў прамое ці ўскоснае дачыненне да абарончых вежаў Верхняга замка (раён Машны), падэшва якіх знаходзіла практычна на адным узроўні з валам (адпаведна 116—118 м супраць 122—124 м паводле геадэзічных адзнак).

Дакладныя даныя аб шчыльнасці заселенасці даследуемай тэрыторыі, сацыяльным статусе яе жыхароў і ступені ўмацаванасці можна атрымаць пры працягненні археалагічных даследаванняў у Запалоцці. Пазначаны напрамак з'яўляецца адным з прыярытэтных у сучаснай археалогіі Полацка.

Літаратура

Дук Д.У., 2001. Полацкая кафля XIV- сярэдзіны XVI стст. // ГАЗ. № 16. С. 167—173.

Дук Д.У., 2003. Справаздача аб археалагічных раскопках у горадзе Полацку ў 2002 годзе. Частка 2. Фотаальбом // Архіў ІГ НАН Беларусі, спр. 2047.

Заяц Ю.А., 1997. О постройке с изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке // ГАЗ. № 12. С. 92—102.

Клімаў М.В., 2003. Матэрыялы да рэканструкцыі печаў з посудападобнай кафляй // МАБ. № 7. С. 148—154.

Колчин Б.А., 1982. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. М. С. 156—177.

Тарасаў С.В., 2001. Полацк IX-XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн.

Duk D.

Archaeological prospecting on Zapalocie trading quarter in Polack in 2003

Summary

The results of the archaeological prospecting on ancient Zapalocie trading quarter in Polack in 2003 are represented in the article. It revealed the remnants of the fifteenth century feudal estate in the north-eastern part of Zapalocie trading quarter. The cultural layer and archaeological artifacts are described. The author gives a graphical reconstruction of the fifteenth century stove which is the second one known in Polack. The evidence obtained gives the opportunity to put the question about high social states of the fifteenth century trading quarter dwellers.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



1



2

– мяркуемы вал

Мал. 1. План размяшчэння шурфа 1 у Запалоцці (1) з прывязкай да мясцовасці (2).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 2. Профілі сценак шурфа 1 і план мацерыка з рэшткамі печы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 3. Пад'ёмны матэрыял з Запалоцця (тэрыторыя агародаў): шыфернае праслка (1), бронзавы пярсцёнак (2) і бразготка (3), пацеркі з бурштыну (4), шкла (5) і свінцу (6).



Мал. 4. Графічная рэканструкцыя гаршковай кафлі з печы (шурф 1).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 5. Фрагменты пячной дугі (1) і цэглы з печы (2—4).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 6. Керамічныя (1—6, 10), шкляныя (7-8) і каменныя вырабы (9) з шурфа 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 7. Керамічны посуд з шурфа 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мал. 8. Вырабы з жалеза (1—12) і бронзы (13—14) з шурфа 1.



Мал. 9. Графічная рэканструкцыя печы з Запалоцця (зроблена А.Салаўёвым).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова